**Вароніна, А.** Зямля, што пахне домам / А. Вароніна // Міёрскій навіны. – 2024. – 14 лют. – С. 4.

# ЗЯМЛЯ, ШТО ПАХНЕ ДОМАМ

**Афганістан не сніцца міярчаніну Уладзіміру Мельнікаву ў снах, не выклікае выпадковыя ўспаміны наяве. Тое, што мог не вярнуцца дадому, воін-інтэрнацыяналіст асэнсаваў значна пазней. Сумуе па двух гадах, праведзеных на чужыне, бо там спазнаў сапраўднае сяброўства.**



– Прызываўся ў снежні 1986 года з Гомеля, дзе вучыўся ў прафтэхвучылішчы. Нас было чалавек дзесяць. Дабіраліся да Масквы, адтуль да Мары, а затым – у Тагтабазар. Там тры месяцы праходзілі вучэбку, – расказвае **Уладзімір Мельнікаў**. – Затым трапіў у Афган.

Пра тое, што там ідзе вайна, хлопцы ведалі. Маглі адмовіцца, але такой магчымасцю скарысталіся нямногія. Уладзіміру Васільевічу прапанавалі служыць у мотаманеўранай групе «Кайсар». Згадзіўся.

– Па прылёце нам зачыталі загад аб прыбыцці папаўнення і адправілі ў часць. Так пачалася служба, – узгадвае задуменна. – Там добра было. Тыдні праз два мяне адправілі вучыцца на хіміка-лабаранта ў Душанбэ. Мы мелі машыну для ачысткі пітной вады, а працаваць на ёй не было каму. Праўда, займаўся гэтым нядоўга – месяцы два. Пасля зрабілі сваю свідравіну і такая неабходнасць адпала. Хапала і ежы. Белы хлеб пяклі ва ўласнай пякарні. А вось бульба была толькі марынаваная.


د افغانستان جمهوریت
РЕСПУБЛИКА АФГАНИСТАН
د افغانستان د جمهوری رئیس د ۱۳۶۷/ثور/۲۵
نیټې د فرمان له مخې «انټرناسیونالست
پوځي ته د افغانستان د منونکو خلکو له خوا»
د مډال د اخیستلو وياړ لري.
В соответствии с Указом
Президента Республики Афганистан
от 15 мая 1988 г.
награжден медалью
„ВОИНУ-ИНТЕРНАЦИОНАЛИСТУ
ОТ БЛАГОДАРНОГО
АФГАНСКОГО НАРОДА“

دکورنی نوم
Фамилия Мельников
نوم
Имя Владимир
د پلار نوم
Отчество Васильевич
نمبر
№ 240
تاریخ
Дата 25.10.88г

Служыў воін-інтэрнацыяналіст сапёрам, выконваў задачы па суправаджэнні калон і размініраванні. Правяралі дарогі, тэрыторыі. Гэта была своеасаблівая пагранічная зона. Камандзіры вучылі звяртаць увагу на рэчы, якія ляжаць на зямлі, але не падымаць іх – гэта было прыманкай, дзе існавала рызыка падарвацца на міне. Часта даводзілася весці гуманітарныя грузы з прадуктамі і адзеннем, якія атрымлівалі ў асноўным з Савецкага Саюза. Ладзілі аблавы на караваны, якія перавозілі зброю і наркотыкі.

Хутка адаптаваўся дзякуючы таму, што засвоіў два асноўныя правілы: рабіць тое, што загадвае старэйшы таварыш, і не лезці на ражон. Кажа, першым часам не спалі, бо кожную ноч іх абстрэльвалі, або спалі стоячы. Днём мясцовае насельніцтва паводзіла сябе мірна, а пад покрывам цемры бралася за аўтаматы.

Заўважае, што гэты перыяд запомніўся адказнасцю за свае ўчынкі, бо ад дзеянняў кожнага залежыў лёс усёй каманды. Падстаўлялі адзін аднаму плячо людзі розных нацыянальнасцей: рускія,

узбекі, таджыкі. Моцным ударам для Уладзіміра Мельнікава стала гібель найлепшага сябра **Генадзя**. Яго накрыла мінамётнай чаргой. Пасля гэтага стаў задумвацца пра сэнс жыцця:

– Калі страляюць, не страшна. Страх прыхо- дзіць потым, калі разумееш, што мог і не выжыць. Аднойчы нам паказалі фільм, як нас абстрэльваюць. Побач разрываліся рэактыўныя снарады, знеслі паўагароджы і вугал казармы.

Уладзімір Мельнікаў узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа» і юбілейнымі. Дадому вярнуўся 16 лютага 1989 года. На ІЛ-76 іх з саслужыўцамі даставілі ў Мінск, дзе з кветкамі ўрачыста сустрэла моладзь, бралі інтэрв'ю журналісты. У Міёры ехаў на аўтобусе. Кажа, вадзіцель не хацеў браць пасажыра, бо ўсе месцы былі занятыя.

– Гэта была субота. Я ўсю дарогу адстаяў. Выходзіў размяцца ў Докшыцах, Глыбокім. А ў Новым Пагосце стаў і думаю – домам пахне. Чаму менавіта там – не ведаю, бо жылі мы ў Дворышчы. На ра-дзіме я не быў тры з паловай гады, – расказвае. – Зайшоў у дом, а следам мама выйшла з лазні. У ручніку, у цёплым халаце. Яна такой маленькай здавалася.

Не дачакалася ўнука бабуля. 19 сакавіка ён трапіў у Афганістан, яе не стала 20-га. Ні яна, ні бацькі, ні чацвёра братоў не ведалі, што Уладзімір пайшоў на вайну. На канверце ўказваў толькі нумар вайсковай часці. Аднойчы набраў пісьмо на друкарскай машынцы і маці заперажывала, што з ім штосьці здарылася.



Пісаў сваёй будучай жонцы і хлопцам, з некаторымі падтрымлівае сувязі і цяпер. Пра тое, што знаходзіцца ў гарачай кропцы, ведаў толькі аднакласнік, які служыў у Германіі.

У мірным жыцці было няпроста. Працаваў токарам, затым меліяратарам. Пасля таго, як ажаніўся і ў сям'і нарадзіліся двайняты, перайшоў у калгас, цяслярыў у жыллёва-камунальнай

гаспадарцы. Браўся за любую работу. Цяпер працуе рабочым па абслугоўванні будынкаў і збудаванняў у РЦГЭ.

Нячаста ўзгадвае пра Афганістан, але зрэдку ўспаміны ўсё ж усплываюць. Кажа, вярнуўся б туды, каб зноў апынуцца ў атмасферы сапраўднага сяброўства. Абавязкова наведвае мітынг ля помніка «Чорныя цюльпаны» 15 лютага – у Дзень вываду савецкіх войск з Афганістана. А 14 чэрвеня, у чарговую гадавіну смерці сябра, хоча з’ездзіць на яго радзіму ў Светлагорскі раён.

**Алена ВАРОНІНА.**

Фота Казіміра БЛАЖЭВІЧА

і з асабістага архіва Уладзіміра МЕЛЬНІКАВА.

https://mijory.by